УДК 908

# НА ПАЛЕССІ КУТОК ЁСЦЬ ТАКІ…

*В.А. ДУЛУБ, С.М. СПЕКТОР*
*Філіял установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт»*
*«Гомельскі дзяржаўны політэхнічны каледж»*

Сярод густых зялёных лясоў на беразе прыгожай паўнаводнай рачулкі Закаванка раскінулася вёска Малыя Аўцюкі. Напэўна, толькі той, хто вырас сярод неабсяжных лясоў, блакітных лугоў, хто ўдыхаў водар кветак і траў, прачнуўшыся да ўсходу сонца, хто ступіў разок басанож на траву, пакрытую серабрыстаю расою, той з упэўненасцю скажа, што няма лепшай на свеце мясцінкі, чым родная вёска.

Я хачу правесці Вас па зямлі, якая для мяне і мабыць не толькі для мяне – даражэй за ўсё. Самы ўтульны і чароўны кут.

Як магутная рака ўтвараецца з крынічак, так і мы аб мінулым даведваемся з мноства гістарычных крыніц. Мяне зацікавіла гісторыя маёй Радзімы – вёскі Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Таму ў сваёй даследчай рабоце я старалася паказаць гістарычнае мінулае маёй малай Радзімы. Галоўнай мэтай даследванняў з'яўляецца захаванне спадчыны, якая засталася ад продкаў. У аснову работы былі пакладзены архіўныя дакументы, аповеды сведкаў падзей, артыкулы газеты «Калінкавіцкія навіны» і матэрыялы кнігі «Памяць». Пад час збору матэрыялаў я супрацоўнічала з ветэранамі і жыхарамі вёскі Малыя Аўцюкі.

Вёска размешчана ў 13 кіламетрах на ўсход ад г. Калінкавічы. Бліжэйшы населены пункт – вёска Аляксандраўка, якая пачынаецца адразу па вуліцы Першамайскай. За 6 кіламетраў на захад ад вёскі знаходзіцца вёска Сырод. Галоўная вуліца Малых Аўцюкоў – Савецкая – прасціраецца з поўдня ад Гомельскай шашы на поўнач у напрамку да возера, яе працягласць 3 км. Паралельна галоўнай вуліцы працякае рака Закаванка (Гулевіцкі канал), левы прыток Прыпяці даўжынёй 42 км. Вёска размешчана сярод лясоў і калісьці была акружаная балотамі. У 60-я гады XX ст. была праведзена меліярацыя з мэтай асушэння зямель. Так з'явіліся урочышчы Паплавы і Корамка. У канцы 50-х гадоў у вёсцы была праведзена электрычнасць і радыё, у сярэдзіне 60-х гадоў па галоўнай вуліцы была пракладзена шаша, гэта зрабіла жыццё вяскоўцаў больш камфортным. У 80-х гадах з'явіўся вадапровад.

На поўдзень у дзесяці кіламетрах ад Малых Аўцюкоў знаходзіцца вёска Вялікія Аўцюкі. У жыхароў гэтых населеных пунктаў Калінкавіцкага раёна жыве паданне аб тым, што Вялікія і Малыя Аўцюкі набылі свае імя ў часы

аддзялення ад рускай праваслаўнай царквы часткі веруючых, якія не прызнавалі царкоўных рэформаў патрыярха Нікана, што праводзіліся з 1654 года. У той час вялікая колькасць уцекачоў быццам бы асела ў мясцінах, дзе цяпер размешчаны нагаданыя вёскі. Гэтых людзей так і назвалі па колькасці пасяліўшыхся – вялікія і малыя ўцёкі. Ад слова ўцёкі, згодна з паданнем, і пайшла назва вёсак Вялікія і Малыя Аўцюкі. Аднак гісторыя Аўцюкоў пачынаецца задоўга да сярэдзіны XVII ст., калі адбываліся падзеі звязаныя з расколам царквы. Найбольш ранняя з вядомых сёння звестак пра Аўцюкі (першым з'яўляецца населены пункт Вялікія Аўцюкі, Малыя ж Аўцюкі ўзніклі як выселак з асноўнай вёскі) датуецца 1552 годам, калі быў складзены адзін з вопісаў Мазырскага замка. Вядомы этнограф І. А. Сербаў у кнізе «Паездкі па Палессю» [1, с. 51] пісаў пра насельнікаў Аўцюкоў наступнае – «Аўцюк – перш за ўсе жыхар поўдня, брунет, сярэдняга росту і прыгожага целаскладу. Гаворыць ён скарагаворкай з паўднёва-рускім акцэнтам зусім адвольна скарачаючы словы… Акрамя таго ў гаворцы аўцюкоў добра захаваліся формы і звароты рускай прамовы…».

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай 1793 год вёска знаходзіцца ў складзе Расійскай Імперыі. У 1821 годзе адбыліся антыфеадальныя выступленні сялян вёсак Вялікія і Малыя Аўцюкі. Прычына – значны падатковы ціск і недахоп ворнай зямлі. Праблемнае пытанне вырашылася ў 1861 годзе з сялянскай рэформай, якая адмяніла прыгоннае права.

У 1878–1880 гг. экспедыцыяй генерала Жылінскага, на месцы рэчкі Закаванкі, быў пракладзены магістральны канал, што дазволіла асушыць многія балоцістыя мясціны ў наваколлі. Канал будавалі ўручную, з дапамогай рыдлёвак, мясцовыя сяляне. Яшчэ адну функцыю выконваў канал Закаванка – гэта сплаў лесу з навакольных лясоў.

У 70-х гадах XIX ст. непадалёк ад Малых Аўцюкоў будуецца Палеская чыгунка Брэст – Пінск – Гомель. У 1882 годзе па чыгунцы адкрываецца рух.

Усе гэтыя акалічнасці прыводзяць да таго, што вёска знаходзіцца побач з новымі шляхамі зносін. Але гэта асабліва не паўплывала на жыццё вёскі. Сяляне як былі забітымі, неадукаванымі, такімі ж і засталіся. Паводле перапісу 1897 года ў Аўцюцэвічскай воласці 122 двары, 1048 жыхароў, царква, царкоўна-прыхадское і народнае вучылішчы, хлебазапасны магазін, карчма. У 1907 годзе пабудаваны школьны будынак. Між тым культура, адукацыя стан аховы здароўя насельніцтва былі на вельмі нізкім узроўні. Бальніца была толькі ў Мазыры, дзе адзін доктар прыходзіўся на 1880 чалавек. З успамінаў жыхара вёскі П.З. Дулуб аб навучанні ў школе: «Нам, простым дзецям сялян, у школе было вучыцца цяжка. У нас не было падручнікаў, сшыткаў. Каб вывучыць урок патрэбна было абыйсці ўсю вёску, таму што на ўсіх быў адзін падручнік, і мы яго бераглі як святыню. Нас вельмі білі і ў школе я нічому не навучыўся».

У пачатку XX ст., калі ўжо дзейнічала чыгунка, была пралажана насыпная дарога са станцыі Галявіца ў напрамку ўрочышча Паплавы і далей. Дарога называлась «Ляжнёўка». Па гэтай дарозе да першай сусветнай вайны вывозілі лес, які потым пастаўляўся ў Германію.

7 лістапада 1917 года здзейснілася рэвалюцыя. Змагарамі і агітатарамі за савецкую ўладу ў Малых Аўцюках сталі Века Павел Андрэевіч, Севярын Пятро Кірылавіч. У лютым 1918 года пачаўся перыяд нямецкай акупацыі, калі ўся Гомельшчына была далучана да Украіны. Але гэта доўга не працягвалася – моц Чырвонай Арміі расла і 29 чэрвеня былі вызвалены Мазыр і Калінкавічы. Першымі дабравольцамі ў Чырвоную Армію запісаліcь: Малашчанка Ілларыён Сцяпанавіч, Севярын Пятро Дзмітрыевіч, Века Аляксей Фёдаравіч, Малашчанка Карп Сцяпанавіч. 4 красавіка 1921 г. быў ліквідаваны ваенрэўком і створаны Калінкавіцкі местачковы Савет. Грамадзянская вайна скончылася. 1 красавіка 1923 г. адбылася беспартыйная канферэнцыя сялян Аўцюцэвічскай воласці, якая заклікала працоўны народ да аднаўлення разбуранай гаспадаркі сваімі сіламі. У 1925 г. у Малых Аўцюках дзейнічала пажарная ахова, дзе мелась пажарная машына. Аднак 9 верасня 1927 г. у выніку пажару ў вёсцы згарэла 13 пабудоў.

У другой палове 1929 г. у раёне пачалася масавая калектывізацыя сельскай гаспадаркі і ў 1930 г. ў вёсцы арганізаваны калгас «Чырвоны Кастрычнік», першымі арганізатарамі якога былі Века Сямён Ермалаевіч і Шашолка Амяллян Пятровіч. Старшынёй калгаса быў абраны Дулуб Іван Паўлавіч. У 30-я гады XX ст. праз вёску будавалась шаша Гомель – Калінкавічы. У 1937 г. на балоце, каля вёскі быў арганізаваны торфзавод «КІМ». Акрамя таго, праводзілась ліквідацыя непісьменнасці. Пачатковая школа была ператворана ў сямігадовую (у 1935 г. – 248 вучняў). У школе ў 1935 г. адбыўся першы выпуск.

Амаль да пачатку вайны ў вёсцы існавала царква. Яна займала не апошняе месца ў жыцці вёскі і сялян. Званы царквы абвяшчалі аб пажарах, аб смерці і нараджэнні аднавяскоўцаў. На ніве барацьбы з рэлігіяй у 1937 г. скінулі званы і купалы з царквы, і знялі іконастас. Апошнім святаром быў Ждановіч. У пачатку вайны ў царкву звезлі збожжа ўраджаю 1941 года. У тым жа годзе ў Аўцюкоўскай царкве здарыўся канфуз. На званніцу па ступеньках лесвіцы ўзышла «кусцішына» свіння, так як злезці не змагла, то яна звалілась і разбілась. Пасля гэтага выпадку пра Аўцюкі пайшла гуляць па свеце байка. Калі чалавек расказваў камусьці што ён з Аўцюкоў, то яго перапытвалі: «Гэта тыя Аўцюкі, што свіння з царквы ўпала?».

У час вайны ў царкве вялася служба. Пры вызваленні вёскі ад фашыстаў у царкву трапіў снарад і яна згарэла. Так вёска засталася без царквы.

Перад пачаткам вайны вёска налічвала 476 двароў, дзе жыло 1683 жыхароў. Па мабілізацыі былі забраны на вайну мужчыны да 50 гадоў (300 ча-

лавек). Немцы ўвайшлі ў вёску ў канцы жніўня 1941 года. Так пачалося жыццё ў акупацыі. Актывізаваўся партызанскі рух.

Перад вызваленнем вёскі ў кастрычніку 1943 года ўсе жыхары пайшлі ў лес. Жылі ў куранях на Корамцы і Фёдаракава (урочышчы). 8 студзеня 1944 года пачалося генеральнае наступленне. Вёску вызвалілі 14 студзеня, але пры гэтым загінула 290 воінаў.

Калі жыхары вярнуліся ў вёску пасля вызвалення ад фашыстаў, то хаты стаялі адна праз тры спаленых, і тыя былі без вакон і без падлогі. Многія сем'і засталіся без карміцеля, многа было пакалечаных. У гэтых умовах патрэбна было аднаўляць гаспадарку. Вярталіся франтавікі, быў адноўлены калгас «Чырвоны Кастрычнік», які узначаліў Супрун Сяргей Пятровіч. Пакрысе вёска аднаўлялась, з'явіліся новыя вуліцы – Афіцэрская, Балота, Зарэчная.

У 1955 годзе быў пабудаваны будынак новай сямігадовай школы. Да 1956 года ў 8–10 класы вучні хадзілі ў Вялікааўцюкоўскую школу, а ў 1958 годзе ўжо адбыўся выпуск у Малааўцюкоўскай сярэдняй школе – 14 чалавек.

На сённяшні дзень школа з'яўляецца сярэдняй. Тут вучацца з першага па адзінаццаты клас дзеці з вёсак Малыя Аўцюкі, Аляксандраўка, Іосіфава Рудня і Ладыжын. У 10 і 11 класы прыходзяць дзеці з Вялікааўцюкоўскай і Сыродскай базавых школ.

У 1959 годзе ў вёсцы налічвалася 1772 жыхары. У 1960 годзе на месцы калгаса быў створаны саўгас «Галявічы», які потым быў раздзелены на дзве самастойныя часткі – «Галявічы» і «Дудзічы». Новы саўгас узначаліў Табулін Васіль Іванавіч.

У 60–70-я гады жыццё наладзілася і палепшылася, была пабудавана крама каля клуба, а таксама таргovы цэнтр каля шашы.

Асноўным месцам культурнага адпачынку ў аўцюкоўцаў з'яўляецца сельскі Дом культуры. У вёсцы існаваў хор, мастацкім кіраўніком якога з'яўляўся Века Аляксей Пятровіч.

Адной з адметных падзей жыцця вёскі з'яўляецца Рэспубліканскі фестываль гумару, які праводзіцца з 1995 года. Заснавальнік яго – беларускі дзіцячы паэт Уладзімір Ліпскі. Фестываль гумару праходзіць адзін раз у два гады. На фестывальных пляцоўках у вёсках Малыя і Вялікія Аўцюкі праходзяць вясёлыя спаборніцтвы паміж гумарыстамі з усіх абласцей Беларусі. Вядомым беларускім кампазітарам Ігарам Лучанком на словы паэта І. Карэнды напісаны гімн фестывалю. Створаны помнік Каласку і Калінцы, закладзены музей гумару. Усебеларускі фестываль гумару, які праводзіцца ў Аўцюках, паставіў назву вёскі ў адзін шэраг з такімі прызнанымі цэнтрамі гумару, як Габрава, Адэса, Сарочынцы.

Вось такія асноўныя вехі вялікай гісторыі невялічкага кутка Палесся. Шмат матэрыялаў было сабрана. А значыць памяць не загіне. Пачынаючы

даследчую працу, я ставіла толькі мэту стварыць летапіс сваёй вёскі. Але ў час гутарак з аднавяскоўцамі зразумела, что дасягнула чагосьці большага – ускалыхнула прыемныя, а часам і цяжкія, але ўсё ж дарагія сэрцу ўспаміны. Пажылыя людзі дзякавалі за выяўленую цікавасць да іх лёсу. Яны – гэтыя мудрыя старцы – як ніхто разумеюць, што пакуль мы памятаем нашых продкаў і захоўваем іх спадчыну – мы жывем і маем права людзьмі звацца.

**Спіс літаратуры**

1 *Сербов, И.А.* Поездки по Полесью 1911 и 1912 гг. / И.А. Сербов. – Вильна, 1914.
2 Кніга памяці Калінкавіцкага раёну. – Калінкавічы, 1999.

УДК [614.882(091) (476.2)]”1946/1953”

# АВТОТРАНСПОРТ СЛУЖБЫ СКОРОЙ МЕДИЦИНСКОЙ ПОМОЩИ г. ГОМЕЛЯ В 1946–1953 гг.

*А.А. КАПЛИЕВ*
*Государственное научное учреждение*
*«Институт истории Национальной академии наук Беларуси», г. Минск,*
*Ю.В. ПАНКОВ*
*Государственное историко-культурное учреждение*
*«Гомельский дворцово-парковый ансамбль»*

Одним из главных показателей эффективности работы экстренных медицинских служб традиционно считается оперативность прибытия врачей на место вызова. В этом отношении обеспеченность скорой медицинской помощи (СМП) санитарным автотранспортом являлась одним из важнейших компонентов деятельности службы, который имел первостепенное значение при её становлении и развитии, особенно в сложный период восстановления после окончания Великой Отечественной войны. Развитию СМП на территории Гомельщины в послевоенный период посвящен ряд статей в различных изданиях, однако анализ развития транспортного обеспечения экстренной медицины ранее не проводился [8, 10, 11]. Настоящая статья характеризует состояние автотранспорта СМП г. Гомеля в 1946–1953 гг. Источниковой базой исследования стали архивные материалы, относящиеся к деятельности службы СМП г. Гомеля в изучаемый период.

После освобождения территории Беларуси от немецко-фашистских захватчиков в 1944 г. здравоохранение оставалось одной из наиболее пострадавших отраслей хозяйства. В частности, до войны в лечебной